Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс
Пераганцаўскія яслі-сад-базавая школа”

# Фальклорны кірмаш “Вясна-красна на ўвесь свет!”

Аўтар: Гражынская Яніна Чаславаўна
Назва намінацыі: Літаратурны
матэрыял
па матывах твораў вуснай народнай
творчасці (для сярэдняга і старэйшага
школьнага ўзросту)

Пераганцы, 2016

Анатацыя

Мерапрыемства“Вясна-красна на ўвесь свет!”праводзіцца ў незвычайнай форме – фальклорны кірмаш. Духоўныя набыткі адлюстроўваюцца ў сферы традыцыйнай народнай культуры. Вядучыміпрынцыпаміадборуі выкладу матэрыялу мерапрыемстваз’яўляюцца: краязнаўчы,фальклорна-этнаграфічныімаральна-эстэтычны. Навучэнцы ў даступнай для іх форме атрымліваюцьведы аб быце, традыцыях народа, іх культуры, разглядваючы іх у непарыўнымадзінстве.Матэрыял пабудаваны натворах вуснай народнай творчасці: прыкметах, гульнях,батлейцы, а таксамазвесткахаб народным адзенні і абутку, народных стравах.Форма правядзення мерапрыемства дазваляе наглядна, яркаі запамінальнапрэзентавацьматэрыял мерапрыемства.Гэта вызывае цікавасць у навучэнцаў, спрыяе фарміраванню ў іх павагі да свайго народа, іх культуры.

Такім чынам, фальклорны кірмаш “Вясна-красна на ўвесь свет!” з’яўляеццадзейсным сродкамвыхавання патрыятызму, пашырае веды навучэнцаў пра традыцыйную народную культуру, пра жыццёпродкаў; спрыяефарміраваннюцікаўнасці, дапытлівасці; выхаваннюпачуцця павагі і пашаны да народнай спадчыны.

Фальклорны кірмаш “Вясна-красна на ўвесь свет!”

Мэта: пашырыць веды навучэнцаў пра традыцыйную народную культуру, пра жыццёпродкаў; спрыяць фарміраваннюцікаўнасці, дапытлівасці; выхаваннюпачуцця павагі і пашаны да народнай спадчыны.

Ход мерапрыемства

Актавая зала прыбрана як кірмашовае месца:гандлярскія рады,на якіх ляжыць вопратка і абутак, прылады працы гаспадара і гаспадыні; калёсы стаяць з пакладзенымі клункамі;прымацаваныя ў розных месцах шыльдыз надпісамі ”Карчма”, “Сустрэча”,“Цэнтральная плошча”.

Скамарохі.

1. Паглядзі, колькі кругом людзей сабралася.
2. 2. А чаго яны сышліся, самі, мабыць, не ведаюць. Лепш бы ў хаце сядзелі.
1. Мабыць, на кірмаш збегліся, павесяліцца захацелі.
2. Так! Слухай, браце, што я ведаю. Ехаў адзін наш мужык на кірмаш.У яр спусціўся, а там – лісы карагоды водзяць! І чаго гэта яны?
1. Так, гэта што! Я вось што ведаю. У бабкі Анэлі мышы развесяліліся, бегаюць з вугла ў вугал і пасмейваюцца, а кату Ваську вусы пабрылі. І чаго гэта яны?

Вядучыя(Несцерка і бабка Міхаліна, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы).

Бабка Міхаліна. Адкажу на вашы пытанні. Я ўжо пажыла, многа чаго ведаю. І лісы, і мышы зіму праводзяць ды вясну сустракаюць. І народ тут сабраўся на вясенні кірмашпавесяліцца: адпачыць, патанцаваць, кемлівасцю, розумам “бліснуць”. А называецца ён “Вясна-красна на ўвесь свет!”

Несцерка.Адметнае месца ў народнай культуры займае вясна. Каляндарная вясна пачынаецца з 1 сакавіка, а паводле народнага календара – з 14 сакавіка, на якое прыпадае Аўдоцця-вясноўка. Надыход вясны ў народзе звязваецца з прылётам птушак. Ранні прылёт ластавак і гракоў азначаў раннюю вясну. Качкі прыляцелі тлустымі – вясна чакалася доўгай і халоднай. Пра добрую вясну сведчыць ранні вылет пчол з вулляў.

Бабка Міхаліна. Вясна доўжылася тры месяцы: сакавік, красавік, май. А ці ведаеце вы, мае даражэнькія, чаму вясеннія месяцы так называюцца? (Прысутныя адказваюць). Каб даведацца больш аб месяцах-братах, мы запрашаем вас на галоўнае кірмашовае месца “Сустрэча” (падыходзяць да шыльды з надпісам “Сустрэча”).

(Выходзяць тры вясеннія месяцы-хлапчукі ў зялёных касцюмах, на шапках кожнага напісана: сакавік;красавік; май).

Сакавік. Я трэці месяц года ў грэгарыянскімкалендары. Першы вясенні месяц.Маю 31 дзень. Мая назва ў многіхеўрапейскіхмовахпаходзіцьад Марса, бога вайны.

Наш народ мяне называў спачаткумарэць, марац, а потым сакавік,таму што дрэвыпачынаюць сок пускаць.

З кожным днём снег пачынае чарнець і раставаць. З'яўляюцца "коцікі" на ранніх раслінах. З-пад сухой травы выглядаюць пралескі.

Красавік. Я чацвёрты месяц года ў грэгарыянскімкалендары. Другі вясенні месяц.Маю 30 дзён.Мая назвапаходзіць ад слова aperire (адчыняць, раскрываць).

У выданнях Ф. Скарыны падаеццанароднаямая назва— кветень(што паходзіць ад слоў кветкі, краскі). Паслядоўнаў народзе ўжываліся маеназвы:апрыль,апрэль,красавік. І зараз я так называюся, таму што расліны распускаюцца, усё навокал пачынае красаваць.

У мяне павялічваецца больш шпарка дзень, вяртаюцца з выраю птушкі. Ачышчаюцца ад лёду азёры.

Май. Я пяты месяц года ў грэгарыянскімкалендары. Трэці вясенні месяц. Маю 31 дзень. Мая назвапаходзіць ад багініМаі.У народзе ўжываліся мае назвытравень (ад слова трава) , май. Сучаснаемаё ўжыванне- май – назвазеляніны, асаблівалістанвыхдрэваў.

У мяне працягласць дня павялічваецца на 1 гадзіну і 42 хвіліны. Паплавы і паляны пакрываюцца кветкамі. З'яўляюцца насякомыя, майскія жукі.На палях рунеюць азімыя, узыходзяць яравыя. Звычайна адбываецца першы выган жывёлы на пашу.

Сакавік. Каб больш даведацца пра нас, пра нашы прыкметы, мы запрашаем самых смелых прыняць удзел у конкурсе. Нам патрэбна 6-9 чалавек.

Скамарох. Падыходзьце, не саромейцеся, будзьце як у сябе дома.

Скамарох. За актыўны ўдзел падарунак – абаранак вязка.

(З жадаючых складаюць тры каманды)

Красавік.Заданне кожнай камандзе. Злучыце пачатак і канец прыкметаў, тады даведаецеся аб народных назіраннях, якія характарызуюцькожнага з нас.

(Камандам раздаюцца канверты з падрыхтаваным матэрыялам. Калі адна з каманд першая выканае заданне- конкурс спыняецца).

Адказ.

Сакавік

1. Сакавік часам снегам сее, а часамі сонцам грэе.
2. Сакавік зялёны – ураджай благі.
3. Як у сакавіку туман, дык у жніва дождж – пан.
4. Няма ў сакавіку вады – няма ўкрасавіку травы.
5. Сакавік дажджом імжыцца –хлебабудзе ў рукавіцу.
6. Сакавік мокры –хлеб горкі.

Красавік

1. У красавіку грымот –цёплы будзе год.
2. Красавік сушыць, нічога ззямлі не рушыць.
3. Красавік сініць і дзьме, бабам цяпло нясе, амужык пазірае ды галавою ківае.
4. У красавікузямля прэе.
5. У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе – тадыўсякі не збяднее.

6. Красавік ваду падбірае,красачкамі пускае.

Май

1. Май – жывёлуў поле пхай.
2. Як у маі суха, топадцягвай бруха.
3. Майская травагалоднага корміць.
4. Май халодны,год хлебаробны.
5. Грымоты ў маіспрыяюць ураджаю.
6. Май лясы прыбірае,лета ў госці чакае.

Май. Добрыя веды паказалі каманды. Усе ўдзельнікі назіральныя, уважлівыя. За гэта ад нас, вясенніх братоў, прыміце падарункі. (Удзельнікі ўзнагароджваюцца абаранкамі).

Несцерка.З прыходам вясны нашы продкі чакалі не толькі абнаўлення ў прыродзе, жыцці, добрага ўраджаю, але і даставалі з куфраў вясеннюю вопратку. А калі кірмаш быў, то апраналіся ўсе па- святочнаму.

Бабка Міхаліна. А якія народныя строі вы ведаеце? Успомніце, як называлі сваю вопратку вашы дзядулі і бабулі, што яны апраналі. Звярніце ўвагу на нас, мае даражэнькія! (Прысутныя адказваюць).

Несцерка.Каб больш даведацца пра нацыянальную вопратку і абутак, мы запрашаем вас прайсціся па кірмашовых радах і паглядзець, якія вопратка і абутак карысталіся попытам у людзей. Хто хоча пабыць у ролі экскурсавода і расказаць праадзенне,абутак, якія насілі беларусы вясной?

Скамарох. Просім, просім, падыходзьце,уключайцеся ў гульню.

Скамарох.Самых кемлівых чакае сюрпрыз. Які? Даведаецеся пазней.

(Скамарохі актыўна запрашаюць да удзелу ў конкурсе 2-3 чалавек).

Бабка Міхаліна. Кожныз вас пабывае ў ролі экскурсавода.Для гэтай мэты вы павінны "прайсціся" па гандлярскіхрадах і "набыць" вясеннюю вопратку і абутак. ( Калі патрэбнай вопраткі няма, можна гульцам прапанаваць карткі з назвамі розных відаў беларускага адзення і абутку, прыладаў працы, назваў, страў:хустка-абхінанка, магерка, пацеркі,пас, саян, жупан, андарак, бурдзюк, каптур, кажушок, гэбель,нагавіцы, адрына,кабат (гарсэт), боты, намітка, фартух,кашуля,чаравічкі.Яны выбіраюць карткі толькі з адзеннем і абуткам і трымаюць іх у руках).

Несцерка. Будзьце пільныя, не выберыце нешта недарэчнае. За кожны правільна названы від адзення і абутку залічваецца па 1 балу, а за кожнага злоўленага "самазванца" – пазбаўляецеся1 балу.

(Гульцы адначасова ўдзельнічаюць у конкурсе.)

Адказ.

**Хустка-абхінанка**,**магерка**,**пацеркі**,**пас**,**саян**, **жупан**,**андарак**,бурдзюк, **каптур**,кажушок, гэбель,**нагавіцы**, адрына,**кабат (гарсэт)**,**боты**, **намітка**, **фартух**, **кашуля**, **чаравічкі**. (Вылучаныя — вясенняе адзенне і абутак).

Адрына – халоднаябудыніна для захоўваннякармоў, інвентару.

**Андарак** – спадніца з шарсцяной ці паўшарсцяной саматканкі ў клетку або ў падоўжаныя ці папярочныя палосы.

**Магерка**– мужчынскі галаўны ўбор, валены ці лямцавы, нападобе конусу.

**Боты(чобаты)** - абутак, які шылі з чорнай і жоўтайскурыпераважна «рантовыя» з нізкімішырокіміабцасамі - «падборамі», якіяпрыбівалісятрывалыміжалезнымiцвікамі, а часам падковамі.

Бурдзюк – мяшоксаскурыжывёлы для захоўвання і перавозківіна, кумысу.

Гэбель – сталярскіінструмент для струганнядрэва.

**Жупан –** верхняемужчынскаеадзенне з каляровага сукна.

**Кабат(гарсэт)** – верхняемужчынскае і жаночаеадзенне з цёмнагаваленага сукна абофутра; безрукаўка.

Кажушок – верхняя зімовая вопратка з валенай нефарбаванай аўчыны.

**Каптур** – дзіцячыабожаночы вязаны галаўныўбор, якізавязваеццападпадбароддзем.

**Кашуля** – адзенне з лёгкайтканіны на верхнюю частку цела.

**Нагавіцы** - штаны, якіяшылі з аднатоннага ці шарачковага палатна, са зрэбнай або паўсуконнай тканіны.

**Намітка** – доўгівузкі кусок кужэльнагапалатна, звычайна з каймой абовышыўкай; галаўныўборзамужніхжанчын.

**Пас** – тое, што і пояс.

**Пацеркі(каралі)** – шыйнае і нагруднае ўпрыгожванне жанчын у святочным касцюме.

**Саян** – спадніца з прышыўнымліфам-гарсэтам.

**Фартух –**жаночаяадзежа з рознай вышыўкай, якуюнадзяваюцьспераду наспадніцу.

**Хустка-абхінанка** – жаночы галаўны ўбор, квадратны кавалак тканіны прызначаны для пакрыцця галавы і плячэй.

**Чаравічкі** – жаночы святочны абутак.

Бабка Міхаліна.Ну што, дарагія ўдзельнікі, пахадзілі, прыгледзеліся да тавару. А зараз правядзіце для нас экскурсію, раскажыце пра вопратку і абутак, якія насілі беларусы. (Гульцы па чарзе вядуць свой аповед). Малайцы, экскурсаводы. Добра справіліся з заданнем.

Несцерка.А цяпер – абяцаны сюрпрыз. Скамарохі, паднясіце нам чароўны куфэрак(у ім ляжаць пацеркі, пернікі, цукеркі з цукру). Выберыце для сябе падарунак самі.

Скамарох (адкрываючы куфэрак, прыгаворвае): Ах, якія прыгожыя, якія смачныя. Я б таксама не адказаўся ад такога падарунка. (Прапаноўвае ўдзельнікам).

Бабка Міхаліна.Нашы продкі ўмелі не толькі працаваць, але і адпачываць, весяліцца. А які ж кірмашбез гульняў і танцаў.

Несцерка.Люблю танцы. Запрашаем усіх на цэнтральную кірмашовую плошчу, каб павесяліцца, патанцаваць(падыходзяць да шыльды з надпісам "Цэнтральная плошча").

Скамарох. Сапраўды, пара ўжо і паскакаць. Ногі так і чэшуцца полечку станчыць.

Скамарох. А мне хочацца пагуляць, пасваволіць. Аж рукі свярбяць, каб кагосьці ўшчыпнуць.

(Гучыць музыка.Скамарохі, бабка Міхаліна, Несцерка запрашаюць гасцей на танец. Усе танцуюць полечку).

Бабка Міхаліна.Даўно так не танцавала. Аж маладосць успомнілася (робіць выгляд, што стамілася, стараецца аддыхацца) і ногі не баляць. Ну, значыць прадоўжым весяліцца.

Цяпер пагуляем у народныя гульні. Запрашаем усіх, калі ласка. Гульняназываецца “Жыта”. Гэта старажытная гульня-карагод. Праводзілася яна на вясенняе свята Юр’я. Людзі збіраліся амаль усёй вёскай, “хадзілі на ранняе жыта, калі ў ім можа схавацца варона”. Вадзілі карагод, каб быў добры ўраджай.

Умовы гульні: нам патрэбнавыбрацьГаспадара. Астатнія ідуць карагодам, імітуючы рост, калыханне жыта, пасярэдзіне якога стаіць Гаспадар. Ён прамаўляе (даецца картка з тэкстам):

Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,
А дзе не бывае,
Там палягае.

Пасля апошняга слова Гаспадара ўдзельнікі хутка садзяцца на кукішкі ці валяцца на зямлю. Той, хто не паспеў гэтага зрабіць, выконвае ролю Гаспадара.

(Праводзіцца гульня. Удзельнікі ўзнагароджваюцца выпечанымі з цеста ці зробленымі з паперыптушачкамі).

Несцерка. А я хачу правесці з вамі гульню “Рэдзька”. Запрашаю двух хлопчыкаў і жадаючых пагуляць дзяўчынак.

Скамарох.Гэта мая любімая гульня. Явыберу дзяўчынак для яе, а хлопцы самі хай выходзяць.

Несцерка. Гульня праводзіцца наступным чынам: дзяўчынкі становяцца ў круг, трымаючыся адна за адну. Агароднік – хлопчык – ходзіць вакол дзяўчынак, шчыпае іх, штурхае, робячы выгляд, што на полі пасаджаную рэдзьку абкопвае, палівае.

Адна з дзяўчынак прызначаецца Паняю. Яна садзіцца ў куце на лаўку і пасылае свайго Слугу – хлопчыка – па рэдзьку. Хлопчык, падышоўшу да Агародніка, гаворыць:

- Добры дзень! Ці пусціш рэдзьку рваць? Пані захварэла – рэдзькі захацела.

Агароднік адказвае:

- Мая рэдзька караністая, маладзістая. Рві, калі вырвеш.

Слуга пачынае штурхаць дзяўчынак (скамарохі памагаюць), тыя ўпіраюцца, пакуль яму нарэшце ўдаецца выцягнуць адну з раду. Потым Слуга вядзе Рэдзьку да Пані, і тая да таго часу шчыпае Рэдзьку, пакуль яна не дасць выкуп. Гульня працягваецца, пакуль слуга не выцягне ўсю рэдзьку.

(Праводзіцца гульня. Удзельнікі ўзнагароджваюцца выпечанымі з цеста ці зробленымі з паперы птушачкамі).

Скамарох. Пагулялі, пасваволілі.А…(прыпыняе сваю размову і ўглядаецца ў канец гандлярскага рада). Гляньце, паглядзіце, на наш кірмаш батлейка прыехала.

Скамарох. Сапраўды. Паспяшаемся, хутчэй. Цікава, пра каго сёння раскажуць нам батлеечнікі: пра злодзея? пра цыгана? ці чым новым павесяляць?

(Пастаноўка інтэрмедыі (батлейкі).

Сцэна1-я

Уваходзіцьмужык з падвязанымжыватом і скардзіцца на боль страўніка.

М а ц е й. Ой-ой-ёй, ой-ой-ёй,
Ой-ёй! Як жывотбаліць!
Ой! Нястраўнасць,
ПрапаўМацейзусім!
О, дзеткі!!!
А цінямасярод вас дактарочка?
Няма?
О!.. Тадыпрапаў, прапаўзусім.
З'яўляеццадоктар.
Д о к т а р. Дзень добры, Мацей!
М а ц е й. О! Дзень добры, панок!
Д о к т а р. Чагоскардзішся, на штоскалычыш?
М а ц е й. Ды во, аб'еўся
І не магу дадомудапаўзці.
Паночак! Памажы, прапаўзусім!
Д о к т а р. А ну-ка, дай, кладзіся!
М а ц е й. Як... так? (лажыцца папярок лавы)
Д о к т а р. Нятак!
М а ц е й. Так? (ногі ўгору закідае)
Д о к т а р. Нятак!
М а ц е й. Дык чортцябеведаетады, пан, і як?
Д о к т а р. Мацей!!
М а ц е й. Што?
Д о к т а р. Дык цябесямілетняятрасца трасе.
А ну-ка, стаўсяспінай,
Зараз мы цябебудземлячыць.
Мацей! Пацей, Мацей! Пацей, Мацей! Пацей...
М а ц е й. Ой-ой-ёй... напацеў, напацеў,
А сам да д'яблапаляцеў,
А мне сказаўузяцьмоху,
Чартапалоху, мышынагазэльцу, камарынагашмэльцу.
Усёгэтаўзяць, змяшацьдывыпіць.
Так зрабіў.
Можа, крыху і палягчае?
А, дзеткі? Пайду.

(Спявае народную песню і сыходзіць са сцэны).

Сцэна2-я

Выбягаецыган і шукае сваю кабылу.

Ц ы г а н. Чачынька-чачынька, ой-му!

Добры дзень, дзеткі!

А ці не бачылі вы маёйклячанькі?

Не, ну тады я сам яепаклічу.

"Кабыла, а кабыла! Хадзі сюда жыва!"

"Косю, косю, косю".

А-а-быдло, і-і-га-га-га!

Цоканнеканя. Кабылаімклівабяжыць проста на гаспадара. Цыган ад страху траціцьпрытомнасць. Прыходзіцьягожонка.

Ц ы г а н к а. Сенька, а Сенька!

Ц ы г а н. Чаготабе, мая жонка?

Ц ы г а н к а. Што за ліхатабе стала: ці ад круп, ці ад сала?

Ц ы г а н. Не ад круп, не ад сала, мяне мая кабыларастаптала!

А ты сама дзепрападала?

Ц ы г а н к а. Радуйся, Сенька-Гаўрылка, --

ТваяАкулінапрыйшла з рынку.

Я хадзілаваражыць і прасіць капусты,

Каб не былінашыяжыватыцыганскія пусты.

Ц ы г а н. Ах жа ты, шэльма, ах жа ты, зладзейка!

Ах жа ты, валацуга,

А ці спёрла ты мне індыкаціпарсюка?

Ц ы г а н к а. Спёрла, спёрла і індыка, і парсюка!

Ц ы г а н. Ты... Дык чаго ж ты мне адразу не сказала?

Я б цябе не біўтадынават.

Ну, давай пацалуемся, белая мая

галавешачка *(цалуе)*.

Каму гадка, а нам з ёю сладка *(цалуе)*.

Ц ы г а н к а. Сенька, годзетабецалаваць,

Пара нашы жываты цыганскія напаўняць.

(Гаворачы аб чымсьці пра сябе, сыходзяць са сцэны).

Скамарох. Ад душы пасмяяўся. Ну і дасціпны, кемлівы ў нас народ.Штосьці і мне захацеласяпадсілкавацца (гладзіць сябе па жываце).

Скамарох. Сапраўды, кішкі марша граюць. За танцамі і гулямі забыўся пра яду. А вы, удзельнікі кірмашу, як на гэта глядзіце.

Бабка Міхаліна.Зараз мы гэта хутка выправім, завітаему карчму да гаспадара Мікіты. Пайшлі хутчэй ( падыходзяць да таблічкі з надпісам “Карчма”).

Несцерка. Тут гатуюць толькі народныя стравы. Пагэтаму будзьце вельмі ўважлівымі пры выбары страў. Хто хоча падсілкавацца? (Выбіраюцца жадаючыя – фарміруюцца дзве каманды).

Бабка Міхаліна. З прапанавых відаў народных страў вы павінны выбраць сабе суп, штосьці мучное ці мясное і які-небудзь напой.

Скамарох. Калі гаварыць па-нашаму, вы павінны выбраць сабе абед з першага, другога і трэцяга блюдаў.

(Камандам раздаюцца меню з назвамі страў, яны павінны выбраць блюды і патлумачыць іх значэнні: жур, пячыста, мачанка,поліўка,верашчака, кляновік, сідар,ламанцы, наліснікі,панцак, калдуны,узвар, збіцень,рубцы.

Адказ.

Назвы першых традыцыйных беларускіх страў:

Жур – негусты аўсяны кісель.

Поліўка – дужа тлусты гарачы суп, падбоўтаны мукой.

Панцак – пярловы суп з грыбамі.

Назвы другіх традыцыйных беларускіх страў:

Верашчака – рэдкая мучная страва з мясам, каўбасой і рознымiпрыправамі.

Мачанка – мяса з рэбрамі і сялянская каўбаса, абсмажаныя, тушаныя і злучаныя з соусам.

Пячыста – усякаесмажанае мяса.

Калдуны – клёцкі, начыненыямясамабоіншым фаршам.

Наліснікі – тонкіяблiны з пшанічнаймукі.

Рубцы – фаршыраванысвіныстраўнік з мясам і грэцкайкашай.

Напоі:

Узвар - адвар з ягадаў, траў.

Збіцень – гарачаепітво з мёдам і спецыямі.

Сідар – віно з яблыкаў.

Кляновік- кляновысок.

Несцярка. Ах, якія вы ўсе малайцы. Аж слінкі пацяклі ў мяне. А ў цябе, бабка Міхаліна? (Ківае галавой і згаджаецца).А цяпер мыхочам вас пачаставаць нашымі беларускімі стравамі. (Удзельнікаў конкурсу, як і ўсіх гасцей, частуюць прыгатаванымі народнымі стравамі: панцаком, каўбасой, наліснікамі, верашчакай, узварам).

Бабка Міхаліна. Шаноўныя госці, ці добра было на святочным кірмашы?Ці набылі сабе “тавар”?

Скамарох.Весялілі, як умелі.
Скарысталі нават ваш
Розум, кемлівасць, азарт.

Скамарох. Хай вам шчасціць у вучобе!
Хай дзясятак будзе болей!

Несцерка.Каб вам смачна спалася і лёгка ўставалася!
Здароўя на доўгія гады і ніякай нуды!

Усе. Бывайце здаровы, жывіце багата!

(співаюць песню).

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Вількін, Я.Р. Беларускіянародныягульні / Я.Р.Вількін. – Мінск: Народная асвета, 1996. –86 с.

2. Лозка, А.Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А. Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. –183 с.

3. Цітавец, А. В. Матэрыял па вывучэнні традыцыйнай народнай культуры ў сярэдняй школе/ А. В. Цітавец. -Беларуская мова і літаратура№ 2, 2004. – с.50.